Учитывая результаты мониторинга внутрипищеводного рН и ЭГДС, больному назначена антисекреторная терапия (пантопразол 40 мг 2 раза в сутки) и прокинетический препарат (домперидон 10 мг 3 раза в день). Через 12 дней лечения больной выписан из стационара в удовлетворительном состоянии с рекомендацией продолжить антисекреторную терапию в течение 4–6 месяцев с переходом на поддерживающую дозу пантопразола.

***Заключение***

Таким образом, суточный внутрипищеводный рН-мониторинг в комплексе с ЭГДС позволяет эффективно диагностировать ГЭРБ, в том числе эндоскопически негативную форму заболевания. Ранняя диагностика и своевременное лечение ГЭРБ позволит предупредить развитие ряда осложнений и будет способствовать повышению качества жизни пациентов.


**ЛИТЕРАТУРА**

1. Руководство по гастроэнтерологии / под ред. Ф. И. Комарова, С. И. Рапопорта. — М.:ООО «МИА», 2010. — С. 139–150.
2. *Рапопорт, С. И.* Гастроэзофагеальная рефлюксная болезнь: пособие для врачей / С. И. Рапопорт. — М.: ИД «МЕДПРАКТИКА-М». — 2009. — 12 с.
3. Epidemiology of gastro-oesophageal reflux disease: a systematic review / J. Dent [et al.] // Gut. — 2005. — Vol. № 54(5). — P. 710–717.
4. *Savarino, V.* Is acid relevant in the genesis of dyspeptic symptoms associated with nonerosive reflux disease? / V. Savarino, E. Savarino // Eur. J. Gastroenterol& Hepatol. — 2008. — Vol. 20, № 4. — P. 252–254.



**УДК 378.661-057.875(476.2)**


## ДА ПЫТАННЯ ВЫЗНАЧЭННЯ ЭКСТРАЛІНГВІСТЫЧНЫХ ФАКТАРАЎ ІСНАВАННЯ ЎЛАСНАГА ІМЯ


***Карніеўская Т. А.***

**Установа адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**


***Уводзіны***

Уласныя імёны ў сваім існаванні рэгулююцца двума тыпамі фактараў: лінгвістычнымі і экстралінгвістычнымі. Прычым, трэба адзначыць, што залежнасць ад апошніх з’яўляецца больш моцнай, чым ад першых. Даследчыкі адзначаюць, што онімы падлягаюць зменам ў адпаведнасці не толькі з законамі мовы, але і з некаторымі сацыяльнымі, юрыдычнымі і гістарычнымі заканамернасцямі.

***Мэта даследавання***

Вызначэнне экстралінгвістычных характарыстык існавання антрапоніма як сінкрэтычнай моўнай адзінкі, зыходзячы з існуючых у сучасным ўсходнеславянскім мовазнаўстве канцэпцый вызначэння ўласнага імя.

***Метады даследавання:*** апісальны, аналітычны.

Спецыфіка прадмета анамастыкі заключаецца ў тым, што лінгвістычны ў сваёй аснове, ён уключае таксама этнаграфічны, гістарычны, геаграфічны, сацыялагічны, літаратуразнаўчы кампаненты, якія дапамагаюць лінгвісту вызначыць спецыфіку называемых аб’ектаў і традыцыі, звязаныя з іх найменнем.

Анамастычная сістэма на самой справе — дастаткова складаны механізм, які «ўключае семантычна і функцыянальна розныя адзінкі, бо ўласныя імёны называюць шырокае кола разнастайных суб’ектаў, аб’ектаў, паняццяў» [1]. У склад экстралінгвістычнага аспекта значэння імя ўваходзяць і асаблівыя ўмовы існавання імя ў грамадстве, і культурна-гістарычныя асацыяцыі, з ім звязаныя, і спецыфіка сувязі імя з называным аб’ектам, і ступень вядомасці аб’екта і яго імя. Нават сам працэс надання імя залежыць ад пэўных фактараў, якія разумеюцца носьбітамі мовы ў большай ці меншай ступені і залежаць ад грамадскай і індывідуальнай інфармацыі пра пэўны антрапонім. Таму ў кожную эпоху ў кожнага народа былі свае імёны і свой адметны падыход да выбару таго ці іншага антрапоніма.



Репозиторий ГомГМУ

Анамастыконы розных эпох істотна адрозніваюцца адзін ад аднаго. Тлумачыцца гэта розным успрыняццем імён у розныя эпохі, рознай сацыяльнай адзнакай канкрэтных тыпаў антрапонімаў, зваротам да розных матывацый імён, прадыктаванымі патрабаваннямі эпохі. Такая сітуацыя стала магчымай таму, што асабовае імя валодае лексічным фонам. Яно, мабыць, і сапраўды не мае лексічнага значэння, але яго лексічны фон аказваецца вялізным і якасна складаным. Семантычныя долі фону асабовага імя, з аднаго боку, адносяць яго да сукупнасці аднародных імён, а, з другога боку, надаюць канкрэтнаму імя непаўторны воблік, індывідуалізуюць яго.

Лексічны фон любога антрапоніма залежыць ад шэрагу фактараў. Многія папулярныя імёны ў кожнага народа валодаюць багатай пазамоўнай інфармацыяй. Яна праяўляецца праз ужыванне пэўных антрапонімаў:

1) у прыказках, прымаўках, загадках;
2) у рэпрэзентатыўным (сімвалічным) сэнсе;
3) у асацыяцыі з пэўнымі героямі, персанажамі;
4) у суаднесенасці з канкрэтнымі гістарычнымі асобамі;
5) у праяўленні іншых асацыятыўных прыкмет на індывідуальным, групавым, грамадскім узроўнях.

Згодна з такім пунктам погляду, носьбіты мовы даволі лёгка класіфікуюць уласны нацыянальны іменаслоў па розных прыкметах:

1) узрост імя;
2) паходжанне імя;
3) сацыяльная афарбоўка;
4) стылявая прыналежнасць;
5) ужывальнасць;
6) тэрытарыяльная залежнасць.

Адзначым таксама, што аб'ём і дакладнасць інфармацыі па такіх паняццях залежаць перш за ўсё ад індывідуальных ведаў кожнага носьбіта.

Таму кожнае імя з іменаслову выражае групавую інфармацыю, сігналізуе аб сваёй прыналежнасці да супакладзеных імён, так што ўвесь іменаслоў распадаецца на асобныя, супрацьпастаўленыя адна адной сукупнасці. Вядома, што такая пазамоўная інфармацыя значна ўплывае на частотнасць ужывання пэўнага імя ў розныя перыяды развіцця грамадства. Зразумела, што пазамоўныя фактары існавання імён праяўляюцца ў паўсядзённым ужыванні апошніх. Аднак даследчыкі афіцыйных формаў антрапонімаў адзначаюць, што такі грамадска-этычны аспект у пэўнай меры спрыяе кадыфікацыі антрапанімнай сістэмы. Прычым пад грамадска-этычным фактарам маецца на ўвазе сістэма моўных прадпісанняў аддзелаў запісу актаў грамадзянскага стану і кадыфікацыя асноўных формаў імён, а таксама знікненне не падыходзячых з моўнага ці грамадскага пункту погляду антрапонімаў. Такім чынам, пазамоўныя фактары спрыяюць станаўленню афіцыйнага іменаслову.

У любым развітым грамадстве існуе такое паняцце, як афіцыйны іменаслоў. Яго складаюць кадыфікаваныя імёны, г. зн. такія, што на працягу доўгага часу станаўлення пэўнай нацыі замацаваліся ў якасці спецыфічнага нацыянальна-культурнага кампанента. Аднак у сучасным грамадстве большасць такіх імён мае іншамоўнае паходжанне. Прычынай таму — пазамоўныя фактары, у першую чаргу палітычныя і рэлігійныя.

Справядліва таксама адзначыць, што па меры росту і развіцця палітычных, рэлігійных і іншых інстытутаў грамадства асобныя імёны станавіліся ўвасабленнем канкрэтных ідэй, палітычных напрамкаў і арыентацый, нават своеасаблівымі дэвізамі. Пры разглядзе такога паняцця, як афіцыйны іменаслоў, набывае сваю актуальнасць юрыдычны аспект анамастычных даследаванняў, які ставіць сваёй мэтай выяўленне

Репозиторий ГомГМУ

катэгорый уласных імён, якія маюць у дадзенай дзяржаве ў дадзеную эпоху прававы статус, вызначэнне працэсаў, якія маюць юрыдычнае значэнне. Апошнім часам гэтае пытанне тычыцца не толькі тапанімічных даследаванняў, як было раней, а ўсё большую актуальнасць набывае юрыдычнае даследаванне антрапанімікону.

У сучасным беларускай антрапонімнай сістэме (маецца на ўвазе сістэма менавіта асабовых імён як такіх) склалася няпэўная сітуацыя. Звязана яна ў першую чаргу з тым, што многа ўвагі было нададзена вывучэнню народных формаў імён і іх існаванню ў жывым маўленні. У сучасным грамадстве вялікую ролю адыгрываюць менавіта афіцыйныя формы антрапонімаў. У сувязі з тым, што адсутнічаюць пэўныя правілы перадачы онімаў на беларускую мову, дадзеная праблема параходзіць ужо ў юрыдычную сферу. Таму на сучасным этапе патрабуецца дакладнае размежаванне афіцыйных і размоўных формаў імён, а таксама выпрацоўка аднастайных правілаў перадачы іншамоўных, нетрадыцыйных для беларускага грамадства, антрапронімаў на нацыянальную мову. Азначаны факт яшчэ раз даказвае сцверджанне, што на фарміраванне іменаслоўнай сістэмы вялікі ўплыў аказваюць менавіта пазамоўныя фактары.

Улічваючы вышэй разгледжаныя фактары, можна зрабіць наступныя ***вывады***:

1. Паняцце экстралінвістычных фактараў у антрапаніміі – даволі шырокае паняцце, таму што ў адпаведную складаючую іменаслову «ўваходзіць уся інфармацыя, звязаная з жыццём, дзейнасцю, характэрнымі рысамі носьбіта таго ці іншага антрапоніма» [2].

2. Антрапанімікон — універсальная сістэма грамадскага значэння са сваёй спецыфікай, сваімі тэндэнцыямі. Вывучэнне гэтай лінгвістычна-грамадскай з'явы дазволіць універсалізаваць веды памежных навук, зрабіць даследаванне з'яў і змен у чалавечым грамадстве больш поўным і стварыць цэласную мадэль грамадскага накірунку.

3. Антрапанімічныя знакі, якімі з'яўляюцца імёны – не толькі моўныя катэгорыі, але і «сацыяльныя адмеціны жыцця грамадства. Знаходзячыся ва ўзаемасувязі, яны ствараюць жывое сведчанне часу» [3].


**ЛІТАРАТУРА**

1. Беларуская антрапанімія: вучэб. дапаможнік / Г. М. Мезенка [і інш.] — Віцебск: УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2009. — 254 с.
2. *Саликова, И. А.* Проблема лексического значения антропонима / И. А. Саликова // Беларуская анамастыка. Гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 20 крас. 2010 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ.; рэдкал.: І. Л. Капылоў [і інш.] — Мінск, 2010. — С. 178–182.
3. *Юрэвіч, У.* Слова жывое, роднае, гаваркое... / У. Юрэвіч. — Мінск: Маст. літ., 1998. — 282 с.


**УДК 616.61-002.2**

## БОЛЕЗНЬ ХОРТОНА В ПРАКТИКЕ ТЕРАПЕВТА


***Карпович Ю. И., Карпович Ю. И.***

**Учреждение образования**
**«Гродненский государственный медицинский университет»**
**г. Гродно, Республика Беларусь**


Системные васкулиты — группа заболеваний, при которых ишемия и некроз тканей развиваются вследствие ишемии сосудов. Системные проявления разнообразны и зависят от типа, размера и локализации пораженного сосуда, а также активности системного воспаления. При системных васкулитах воспаление сосудов является сущностью болезни — в отличие от других заболеваний, при которых васкулиты — лишь компонент патологического процесса, например, при ревматизме, РА и ДБСТ и др. Системные васкулиты характеризуются широко распространенным поражением сосудов, ишемией и нарушением функции соответствующей зоны [1].

Среди общих механизмов развития системных васкулитов основное значение придается иммунопатологическим процессам, в первую очередь иммунокомплексным. Од-



Репозиторий ГрГМУ